Колонизация Луны для Говинда – необходимость. Он утверждает, что использование всех возможностей для исследований жизненно важно для обогащения человеческого опыта, и неспособность сделать это неминуемо приведет к ощущению заточения в пределах Земли.

Анализ размышлений Сэммлера проявляет его стремление пересмотреть свое отношение к Земле. Теперь главный герой рассматривает ее не как фиксированную реальность, а как нечто, от чего можно оттолкнуться. Луна в романе становится символом спасения и олицетворяет надежду на улучшение жизни. Незаметно для себя Сэммлер начинает убегать от реальности в свои размышления о Луне, об ином мире, где все совершенно иначе:

| |
|---|
| At moments like this Mr. Sammler was more than ever pleasantly haunted by moon -visions. Artemis – lunar chastity. On the moon people would have to work hard simply to stay alive, to breathe. They would have to keep a strict watch over the gauges of all the devices. Conditions altogether different [2; с. 62]. |
| В такие минуты мистеру Сэммлеру было особенно приятно думать о Луне. Лунное целомудрие Артемиды. На Луне людям придется тяжко трудиться, чтобы попросту выжить, попросту дышать. Придется нести бдительную вахту у приборов. В общем, совершенно иная жизнь [1; с. 74]. |

Сэммлер замечает, что окружающие его люди также ищут решение для всепроникающего чувства изоляции, которое они испытывают. У каждого человека есть свое собственное стремление к новому началу, будь то брак, переезд, занятие бизнесом или поиск любви. У каждого человека в окружении Сэммлера есть свой собственный «спутник», источник ответов и решений, создающий баланс между стремлением к единению и желанием убежать от проблем земного существования. Луна в этом контексте становится символом, представляющим коллективное желание вырваться из изоляции. Она воплощает надежду на спасение от одиночества, которое заставляет людей отделяться и уходить от связей с миром и другими людьми.

**Заключение.** Таким образом, проведённый анализ символики романа Сола Беллоу «Планета мистера Сэммлера» позволяет утверждать, что Луна является значимым символом, пронизывающим все произведение и олицетворяющим как изоляцию, так и надежду на лучшее будущее для человечества. Беллоу использует образ Луны как особое метафорическое пространство для обновления и бегства, воплощая стремление главного героя к уходу от сложностей и вызовов человеческого существования на Земле.


1. Беллоу, С. Планета мистера Сэммлера: роман / Беллоу Сол; Bellow Saul; перевод с английского Н. Воронель. – Москва : АСТ, 2000. - 416 с.
2. Bellow, Saul. Mr. Sammler's Planet / Saul Bellow. – Penguin Classics, January 6, 2004. – 288 p.
3. История литературы страны изучаемого языка (английский) : учебно-методический комплекс по учебной дисциплине для специальностей: 1-21 05 06 Романо-германская филология, 1-02 03 04 Русский язык и литература. Иностранный язык (английский) / сост.: А.А. Гладкова [и др.] ; Учреждение образования "Витебский государственный университет имени П.М. Машерова", Фак. гуманитаристики и языковых коммуникаций, Каф. литературы. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2023. – 155, [1] с. URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/36668 (дата обращения: 17.01.2024).


## АКСІЯСФЕРА РАМАНА ЛЮДМІЛЫ РУБЛЕЎСКАЙ «АВАНТУРЫ ПРАНЦІША ВЫРВІЧА, ЗДРАДНІКА І КАНФЕДЭРАТА»


*Д.У. Яромава*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*


Літаратурны твор уключае этычныя, сацыяльныя, рэлігійныя, эстэтычныя каштоўнасці. Гісторыю літаратуры можна расцэньваць як мастацкую гісторыю каштоўнасцяў той нацыі, якой літаратура належыць. Катэгорыя «каштоўнасць» стала

стрыжнёвай у эстэтычнай канцэпцыі культуры вядомых літаратуразнаўцаў, напрыклад, М.М. Бахціна, дзе атрымала метадалагічны статус. Каштоўнасць канкрэтнага мастацкага твора выяўляецца ў працэсе яго функцыянавання і ацэньваецца як крытыкамі, пісьменнікамі, навукоўцамі, так і шырокім колам менш падрыхтаваных чытачоў. У сучаснай беларускай прозе прыцягваюць увагу як дарослых, так і падлеткаў раманы Людмілы Рублеўскай, прысвечаныя Пранцішу Вырвічу. Сёння гэтыя раманы ўтвараюць гепталогію: «Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега», «Авантуры студыёзуса Вырвіча», «Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча», «Авантуры Пранціша Вырвіча, здрадніка і канфедэрата», «Авантуры Вырвіча з банды Чорнага Доктара», «Авантуры Вырвіча, Лёдніка і Чорнай Меланхоліі», «Авантуры Пранціша Вырвіча, маршалка менскага». Пісьменніца ўзнаўляе сацыякультурны змест айчыннага мінулага, якое асэнсоўвае праз стварэнне прыгодніцкай і фантасмагарычнай версіі гісторыі XVIII стагоддзя. У адрозненні ад Уладзіміра Караткевіча, Леаніда Дайнекі і шэрагу іншых аўтараў, якія распрацоўвалі гістарычную тэму, Людміла Рублеўская не прэтэндуе на гістарычную дакладнасць, аднак акцэнтуе каштоўнасны змест у айчынным мінулым, як маральна-этычныя, так і патрыятычныя яго вартасці. Аксіясфера сучаснай беларускай літаратуры патрабуе ўважлівага вывучэння, што і абумоўлівае **мэту** даследавання – раскрыць аксіяферу рамана Л. Рублеўскай «Авантуры Пранціша вырвіча, здрадніка і канфедэрата».

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам выступае раман «Авантуры Пранціша вырвіча, здрадніка і канфедэрата» Л. Рублеўскай, для літаратуразнаўчай ацэнкі якога былі выкарыстаны асноўныя прынцыпы культурна-гістарычнага метада ў спалучэнні з элементамі кантрастыўнага аналізу.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У цэнтры ўвагі Людмілы Рублеўскай створаны вымыслам вобраз шляхціча Пранціша Вырвіча, шмат у чым тыповага носьбіта шляхецкіх звычак, правілаў паводзін свайго сацыяльнага кола. Вобраз шляхціча досыць распрацаваны ў айчыннай літаратуры. Напрыклад, пісьменнікі-рамантыкі, якія ў ліку першых звярталіся да асэнсавання гісторыі беларускага краю, увасаблялі шляхцічаў у іх звыклым асяроддзі. Малюнкі з жыцця беларускай шляхты другой паловы XVIII стагоддзя падаваліся ва «Успамінах Сапліцы» Генрыка Жавускага. Ён стылізаваў свой твор пад старадаўні рукапіс, дзе ў цэнтры ўвагі знаходзіліся «сармацкія» тыпы тагачасных шляхціцаў. Уяўны аўтар рукапісы Севярын Сапліца артыкуляваў патрыятызм і глыбокую рэлігійнасць шляхты праз апісанне рэальных падзей і асоб – Барскай канфедэрацыі, князя Радзівіла Пане Каханку [3]. У айчыннай раманістыцы XX стагоддзя сацыяльны тып шляхціца ўзнаўляецца шматаспектна. У прозе 1945–1965-х гадоў шляхціц характарызуецца праз маёмасны статус: заможны шляхціц выступае прыгнятальнікам, збяднелая шляхта паказваецца пераважна пазітыўна («Світанне» А. Чарнышэвіча, «Серадзібор» П. Пестрака). Амбівалентна ўвасоблены сацыяльны тып шляхціца ў раманах У. Караткевіча: і заступнікам сялян, і прыгнятальнікам («Каласы пад сярпом тваім»), і злачынцам («Чорны замак Альшанскі»). У сучасным беларускім рамане ўвасабленне сацыяльнага тыпу шляхціца абумоўлена развіццём нацыянальнай гістарычнай самасвядомасці. Пісьменнікамі акцэнтуецца ўвага на ўсведамленні паасобнымі прадстаўнікамі дваранства – носьбітамі элітарнай культуры – значнасці народных традыцый; на грамадска-палітычных абставінах, якія перашкаджаюць нацыянальнаму адраджэнню беларусаў. Шляхціцы паказваюцца і грамадска актыўнымі, патрыятычна настроенымі, і грамадска-інертнымі, заклапочанымі ўласным дабрабытам («Літоўскі воўк» А. Наварыча). Лепшыя прадстаўнікі шляхецкага саслоўя рэпрэзентуюцца носьбітамі патрыятызму («Золата забытых магіл» Л. Рублеўскай, «Назаві сына Канстанцінам» Л. Дайнекі).

У свой цыкл раманаў «Авантуры Пранціша Вырвіча» Людміла Рублеўская ўклала ўсё, чым так захапляе нас літаратура гэтага жанру: інтрыгі моцных свету гэтага, таямніцы падзямелляў, пошукі скарбаў, містычныя рэліквіі, выкраданні, сутычкі

не на жыццё, а на смерць, але галоўнае – моцныя духам людзі, іх дакладнае сяброўства і сапраўднае каханне, па якім, верагодна, употай сумуе сёння наш рацыяналістычны і прагматычны свет. Важна адзначыць, што гэтыя захапляльныя падзеі адбываюцца на беларускай зямлі, у родных, добра знаёмых нам месцах – Полацку, Мінску, Слуцку; дзейнічаюць жывыя, зразумелыя нам людзі, у нечым падобныя да нас сённяшніх, і таму ўсё гэта значна больш гаворыць нашаму розуму і сэрцу, чым некаторыя раманы замежных аўтараў падобнага напрамку.

Тэмы, якія раскрываюцца ў рамане, агульначалавечыя, падтрымліваюць класічныя каштоўнасці. Пад каштоўнасцямі маецца на ўвазе сістэма матэрыяльных і духоўных даброт, якія чалавек і грамадства прызнаюць як загадваючую сілу над сабой, якая вызначае намеры, учынкі і узаемаадносіны людзей. Гэтая арыентацыя выяўляецца і ў практычным стаўленні людзей да гэтых каштоўнасцяў. Гэта прымушае нас разважаць, аналізаваць, супастаўляць і перадаваць сваё меркаванне, што вельмі каштоўна і актуальна, падмацоўваючы прыкладамі з гісторыі.

Выключна дакладныя маўленчыя характарыстыкі герояў. Выразна пабудавана і насычана навуковымі тэрмінамі гаворка навукоўцаў – Лёдніка і Пфальцмана, нават калі яны з’едліва іранізуюць адзін з аднаго. Высакапарная і мова магната – калі, вядома, не закрануць яго за жывое. Гаворка кемлівага Пранціша можа быць якой заўгодна – у залежнасці ад пэўнай маўленчай сітуацыі. А вострая мова раз’юшанай карчмарыхі насычаная жывой народнай гаворкай: *«Ой, гора мне, ды каб пада мной зямля трэснула – не было тут ніякіх бандытаў... каб з вас чорная юшка палілася... каб вы жыватом ездзілі ды паміж вушэй вецер свістаў...»* [4; с. 177]. І карчмараўна расце годнай пераемніцай маці: *«Усю карчму перавярнулі... каб іх вантробы на плоце сохлі...»* [4; с. 290].

Псіхалагічная распрацоўка вобразаў больш дакладная і сур’ёзная, чым гэта звычайна ўласціва лёгкаму прыгодніцкаму жанру. Кожны з герояў рамана нададзены індывідуальнымі рысамі, вобразы дадзены ў развіцці, што з’яўляецца характэрнай рысай рэалізму. На працягу ўсяго апавядання героі «не стаяць на месцы», змяняюцца – як гэта бывае і з рэальнымі людзьмі на працягу ўсяго іх жыцця. У Людмілы Рублеўскай «бесшабашны шкаляр», якім пададзены герой пачатку цыкла, «дарастае» да навучанага жыццём чалавека, сапраўднага мужчыны і перакананага патрыёта.

Аксіялагічны змест рамана Людмілы Рублеўскай «Авантуры Пранціша вырвіча, здрадніка і канфедэрата» акцэнтуецца праз адлюстаранне патрыятычнага абавязку і вялікай любові да роднага краю галоўнага героя Пранціша Вырвіча. У сэрцы і думках Пранціша няма жорсткасці і нянавісці да іншых людзей; характар героя прасякнуты патрыятызмам, высокімі маральнымі каштоўнасцямі, сумленнасцю: «*Вырвічы пакаленнямі змагаліся ў войсках князя Астрожскага, – перабіў Пранціш. – Мой пан бацька распавядаў, як радзівілы ды гаштольды праваслаўных Астрожскіх перад каралём абгаворвалі, ад улады адцяснялі… І што?..Кожны шляхціц, прымаючы меч, прысягае, што будзе абараняць бязвінных…*» [4; с. 67]. З Вырвічам кантрастуе вобраз магната Геранімa Радзівіла, сапраўнага гістарычнага персанажа. Гэты герой вылучаецца сярод іншых найперш жорсткасцю ды бязлітаснасцю, нават да ўласных сваякоў: «*Патрапіць у скляпы Радзівіла Жорсткага – усё роўна што ў пекла. Ніхто адтуль не выходзіў жывым, вязні розных званняў гнілі жыўцом… Простых ворагаў князь загадваў зашываць у мядзведжыя шкуры ды сабакамі цкаваць. Але і падлашчвацца да яго небяспечна. Адзін слуга хацеў быў перад панам выслужыцца, сказаў, што мае адзінае жаданне – быць заўсёды на вачах у пана... Дык той загадаў павесіць яго перад сваім акном – каб спраўдзілася мара небаракі. Тры жонкі збеглі ад князя, намучыўшыся...*» [4; с. 123].

Аўтарская ўвага да паказу галоўнага героя дае падставы разглядаць твор як раман выхавання. Як аўтарытэтна даказвае М. М. Бахцін, раман выхавання адыграў значную ролю ў станаўленні рэалістычнага рамана. Нельга паспрачацца з тым, што ў рамане Людмілы Рублеўскай увасабляецца актыўнае ўзаемадзеянне асобы і асяроддзя. Аднак

пры гэтым паслядоўна выяўляецца фантасмагарычны змест, што і заяўлена ў жанравым азначэнні [2].

У рамане мае месца і сур'ёзнае асэнсаванне гістарычных падзей напярэдадні раздзелаў Рэчы Паспалітай, прычым літаратурны густ і пачуццё меры ў суаднясенні сапраўдных гістарычных асоб і створаных вымыслам застаецца на высокім эстэтычным узроўні. Фантасмагорыя Людмілы Рублеўскай заснавана на добрым веданні гісторыі. Асабліва варта адзначыць непрадузятасць пісьменніцы, якая не ўпадае ў «аднабокасць», падтрымліваючы і абяляючы той ці іншы бок канфлікту [1]. У спрэчках нашых «заходнікаў» і «славянафілаў» Рублеўская займае сваю пазіцыю: яна на баку аб'ектыўных фактаў – гістарычнай праўды.

Самавіты гістарычны падмурак адрознівае раман Людмілы Рублеўскай «Авантуры Пранціша вырвіча, здрадніка і канфедэрата» ад гісторыка-прыгодніцкіх раманаў іншых аўтараў. Вальтэр Скот, напрыклад, таксама з павагай ставіўся да гістарычнай асновы свайго прыгодніцкага апавядання, але гістарычны фон яго раманаў значна больш абстрактны, а героі ў сваіх дыялогах не ўдаюцца ў дэталі сучаснага ім грамадскага жыцця.

**Заключэнне.** Прадстаўлены раман Людмілы Рублеўская, як і ўвесь цыкл раманаў пра Пранціша Вырвіча, падкрэслена выразна рэпрэзентуе аксіялагічныя каштоўнасці, у чарговы раз пераконваючы чытачоў у значнасці дабра, розуму, асветы, сумленнасці, любові да людзей і да роднага краю. У рамане раскрываецца цэласны малюнак мінулага праз норавы, звычаі, паводзіны прадстаўнікоў шляхецкага і магнацкага саслоўяў. Духоўныя каштоўнасці героямі вызначаюцца як першасныя, менавіта на іх трымаюцца асновы чалавечага быцця. Павышаная ідэйная і мастацкая роля надаецца другасным героям, што тлумачыць увагу да духоўнага свету героя, афарбаванае ўзнаўленне падзей, выяўленне сюжэтнага руху. Раман «Авантуры Пранціша вырвіча, здрадніка і канфедэрата» будзе прыдатным у выхаваўчай працы, якая праводзіцца з падлеткамі і моладзю, можа быць паспяхова выкарыстаны на ўроках пазакласнага чытання ў старэйшых класах.

1. Бароўка, В.Ю. Аксіялогія беларускай літаратуры : манаграфія / В.Ю. Бароўка. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2020. – 183 с. URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/25513 (дата звароту: 31.01.2024).
2. Навасельцава, Г.В. Мастацкае ўзнаўленне жанравага канона ў сучасным беларускім рамане / Г. В. Навасельцава // Беларуская літаратура і літаратуразнаўства : зборнік навуковых артыкулаў: да 90-годдзя Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы. – Мінск : Беларуская навука, 2022. – С. 143–148.
3. Навасельцава, Г.В. Спецыфіка мастацкага асэнсавання гістарычнага мінулага ў беларускай літаратуры першай паловы XIX стагоддзя / Г.В. Навасельцава // Наука – образованию, производству, экономике : материалы XX (67) Регион. науч.-практ. конф. : в 2 т. – Витебск, 2015. – Т. 1. – С. 140–141.
4. Рублеўская, Л. Авантуры Пранціша Вырвіча, здрадніка і канфедэрата : раман прыгодніцкі і фантасмагарычны / Л. Рублеўская. – Мінск : Звязда, 2017. – 363 с.

## COMMUNICATION STRATEGIES AND TACTICS: CONCEPT AND TYPES

*G.Sh. Bochkova*
*Vitebsk, Vitebsk State University named after P.M. Masherov*

The article deals with communicative strategies and tactics as an integral part of a communicative act. It focuses on the main communicative tactics, their specifics and means of implementation as verbal components of discourse.

A person, represented in linguistics as a linguistic personality, takes part in an unlimited number of acts of communication during his life. In accordance with the purpose of communication, he chooses one or another model of speech behavior to ensure successful and, most importantly, effective interpersonal communication. In order for the act of communication to eventually meet expectations and end successfully, the speaker or writer uses a certain set of speech tools and techniques that contribute to the realization of his intention. This speech arsenal is determined by the communicative strategy [1].